

Добры дзень, сябры!

Пішуць вам выхаванцы Дзешчанскага дзіцячага садка. Мы з вялікім захапленнем чытаем лісты, якія вы нам дасылаеце. І з радасцю дзелімся падзеямі, якія адбываюцца ў нас. Працягваюцца святкі, і мы таксама вырашылі прыняць ўдзел у святкаванні.Каляды.

Каляда - так называўся старадаўні абрад праслаўлення свята Раства Хрыстова песнямі, а таксама і сама песня. Зімовымі вечарамі, калі зусім змеркнецца, па дамах хадзіла Каляда - у вывернутых кажухах, са звярыным маскамі на твары. Калядаванне пачыналі дзеці, маладыя хлопцы і дзяўчаты. Яны пелі пад вокнамі дамоў калядныя песні, жадалі шчасця і здароўя гаспадарам, і атрымлівалі за гэтасалодкія пачастункі.

Калі мы даведаліся пра традыцыі гэтых зімовых святак, то вырашылі таксама падрыхтавацца да святкавання Калядак. Вывучылі калядныя вершыкі і песні, апранулі касцюмы, а таксама ўзялі калядную зорку і мяшок для пачастункаў. Калядаваць пайшлі ў пачатковую школу і ва ўсе групы нашага дзіцячага садка. Нам было вельмі весела! Мы накалядавалі шмат салодкіх пачастункаў, а таксама павіншавалі са святамі і пачаставалі цукеркамі ўсіх дзяцей у нашым садку.

Раскажыце, а як святкуеце Каляду вы?

Да пабачэння! Усяго найлепшага!

Будзем з нецярпеннем чакаць ад вас лісты.

